**Пытанні да ўступных экзаменаў**
**ва ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» на 2024 год**

1. Фальклорныя жанры: казкі, легенды, паданні, песні; беларуская народная творчасць як крыніца станаўлення і ўзбагачэння літаратуры.
2. Кірыл Тураўскі: словы, казанні, павучанні; пропаведзь маральнага ўдасканалення чалавека і грамадства, крытыка чалавечых заганаў.
3. «Жыціе Ефрасінні Полацкай»: адлюстраванне ў творы жыцця і дзейнасці асветніцы, яе духоўнага подзвігу.
4. «Жыццproperly Ефрасінні Полацкай»: рэальныя і гістарычныя факты ў творы, адметнасць кампазіцыі.
5. Летапісы як помнікі літаратуры («Летапіс вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс (1446)» – урывак «Пахвала Вітаўту»): адлюстраванне гістарычнага мінулага ў беларускіх летапісах, іх патрыятычны пафас; услаўленне мужнасці, аўтарытэту князя Вітаўта, яго подзвігаў.
6. Рысы рэнесанснага гуманізму. Францыск Скарына – першадрукар: звесткі з біяграфіі асветніка, яго імкненне наблізіць кнігу да народа, змест прадмовы да «Псалтыра» і іншых кніг Бібліі. Прадмова да ўсёй Бібліі. Прадмова да кнігі «Юдзіф».
7. Паслядоўнікі асветніцкай і кнігавыдавецкай дзейнасці Францыска Скарыны (Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і інш.).
8. Дзейнасць Францыска Скарыны: прадмовы і пасляслоўі да кніг Бібліі, уклад у развіццё кнігадрукавання.
9. Паэма Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра»: гісторыя напісання, жанр, сюжэт і кампазіцыя твора.
10. Тэма Радзімы ў паэме Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра»; сімвалічнае значэнне вобраза зубра; вобраз князя Вітаўта. Высокая аўтарская ацэнка дзейнасці князя Вітаўта.
11. Літаратура эпохі барока: вершатворчасць на беларускай мове Сімяона Полацкага, станаўленне беларускага тэатра (батлейка, школьная драма і інтэрмедыя).
12. Апавяданні Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня», «Плачка», «Белая Сарока» (са зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»): роля вобраза Завальні, рамантычныя сюжэты, сімволіка вобразаў.
13. Балада Адама Міцкевіча «Свіцязянка»: паэтычнае асэнсаванне беларускага фальклору і міфалогіі, рамантычнае вырашэнне тэмы кахання.

14. Паэма Канстанціна Вераніцына «Тарас на Парнасе»: аўтарства і час напісання паэмы; роля міфалагічных персанажаў у раскрыцці тэмы і ідэі.

15. Тарас у паэме Канстанціна Вераніцына «Тарас на Парнасе» як тыповы народны герой, рысы яго характару (кемлівасць, абачлівасць, дасціпнасць); сатыра і гумар у творы.

16. Паэма Францішка Багушэвіча «Кепска будзе!»: выкрыццё сацыяльнай несправядлівасці; роля айчыма ў лёсе Аліндаркі; матыў трагічнасці і безвыходнасці.

17. Ідэйны змест прадмовы Францішка Багушэвіча. да зборніка «Дудка беларуская». Аналіз вершаў «Мая дудка», «Хмаркі» і інш.

18. Фарс-вадэвіль Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта»: жанравае вызначэнне; выкрыццё царскага чыноўніцтва, гратэск і шарж.

19. Фарс-вадэвіль Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта». Вобразы засцянковай шляхты; праблема бацькоў і дзяцей у творы, майстэрства драматурга.

20. Вершы Цёткі «Мае думкі», «Вера беларуса», «Мора»: патрыятычны змест лірыкі, паэтызацыя непаўторнасці і хараства Бацькаўшчыны; асноўныя матывы і пафас вершаў, рамантычна-сімвалічныя вобразы.

21. Ядвігін Ш. Увага да праблем чалавечага быцця, сэнсу і жыцця ў апавяданні «Дуб-дзядуля». Філасофскі сэнс твора. Прытчавая аснова.

22. Беларуская літаратура пачатку ХХ ст. Агульная характарыстыка. Роля газет «Наша доля», «Наша ніва» ў гісторыі айчыннай культуры і мастацтва слова. Фарміраванне класічных асноў беларускай літаратуры. Праявы мадэрнізму ў беларускай літаратуры. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра.

23. Вершы Янкі Купалы «Спадчына», «А хто там ідзе?», «Мая малітва» («Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...»), «Жняя», «Роднае слова» («Магутнае слова, ты, роднае слова!..»): асэнсаванне гістарычнага лёсу беларускага народа; агульначалавечыя матывы ў вершах; жанравае багацце лірыкі.

24. Звесткі пра жыццё і творчасць Янкі Купалы. Аналіз верша «Явар і каліна»: матывы кахання і гармоніі паміж чалавекам і прыродай, інтанацыйнае і вобразнае багацце.

25. Паэма Янкі Купалы «Бандароўна»: фальклорная першакрыніца твора; сутнасць канфлікту; вобразы-антыподы; драматызм дзеяння; маральнае хараство Бандароўны.

26. П’еса Янкі Купалы «Раскіданае гняздо»: сацыяльна-філасофскі змест твора; сюжэтныя лініі; жанравыя асаблівасці, сімвалічнасць назвы твора.

27. П’еса Янкі Купалы «Раскіданае гняздо»: кампазіцыя, развіццё канфлікту; галоўныя героі, матывы іх паводзін; пошукі маладым пакаленнем рэальных шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны; ідэйны сэнс Вялікага сходу.

28. Паэма Якуба Коласа «Новая зямля»: аўтабіяграфічнасць паэмы, яе творчая гісторыя; жанравыя асаблівасці твора; народны побыт і прырода ў паэме.

29. Паэма Якуба Коласа «Новая зямля»: вобразы Антося, Ганны, дзяцей; трагедыя лёсу Міхала; філасофская ідэя зямлі і волі; сімвалічны сэнс назвы твора.

30. Трылогія Якуба Коласа «На ростанях». Гісторыя напісання і праблематыка, аўтабіяграфізм твора, яго сюжэтныя і кампазіцыйныя асаблівасці.

31. Аповесць Якуба Коласа «У палескай глушы»: жанравыя адметнасці; прататыпы галоўных герояў; вобраз Андрэя Лабановіча – беларускага інтэлігента, шукальніка ісціны, сэнсу жыцця. Майстэрства Коласа-празаіка.

32. Народ і інтэлігенцыя, жаночыя вобразы ў аповесці Якуба Коласа «У палескай глушы». Багацце мовы твора, дэталізацыя.

33. Звесткі пра жыццё і творчасць Якуба Коласа. Паэтызацыя роднай прыроды ў творчасці (вершы «Родныя вобразы», «Першы гром», паэма «Новая зямля» і інш. ). Рытміка-інтанацыйны лад твораў.

34. Звесткі пра жыццё і творчасць Максіма Багдановіча. Вершы «Раманс» («Зорка Венера»), «Маладыя гады», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы…», «Плакала лета, зямлю пакідаючы…» і інш. як адлюстраванне гармоніі, красы і кахання ў жыцці.

35. Вершы Максіма Багдановіча «Слуцкія ткачыхі», «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»), «Жывеш не вечна, чалавек...», «Песняру», «Кніга», «Летапісец», «Мяжы» і інш.: нацыянальнае і агульначалавечае ў паэзіі; услаўленне красы жыцця і мастацтва; зварот да культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі; філасофскі пачатак у лірыцы.

36. Вершы Алеся Гаруна «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...», «Ідуць гады» і інш.: вызваленча-патрыятычныя матывы, агульначалавечыя каштоўнасці, абвостранае пачуццё любові да Радзімы; праблемы сэнсу жыцця, прызначэння чалавека; філасафічнасць і публіцыстычнасць вершаў.

37. Беларуская літаратура 1920-х – 1930-х гадоў: агляд. Актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і культурнага будаўніцтва ў 1920-я гады. Літаратурныя аб’яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», БелАПП і інш., іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства.

38. Творчыя здабыткі і пошукі ў літаратуры 1920-х гадоў і іх спад у 1930-я гады пад уплывам ідэалагізацыі літаратурнага жыцця.

Становішча, у якім апынуліся беларускія пісьменнікі ў 1930-я гады. Літаратура Заходняй Беларусі, яе сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай (Уладзімір Жылка, Максім Танк і інш.).

39. Апавяданне Максіма Гарэцкага «Роднае карэнне»: тэма вернасці роднай зямлі, служэння інтэлігенцыі свайму народу, вобраз Архіпа Лінкевіча.

40. Апавяданне Максіма Гарэцкага «Літоўскі хутарок»: трагізм лёсу герояў; антываенная скіраванасць твора; чалавек і абставіны ў творы.

41. Апавяданне Змітрака Бядулі «Бондар»: асэнсаванне праблемы мастака і мастацтва; асуджэнне эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці; мастацкія адметнасці твора (сціпласць, драматызм, псіхалагізм).

42. Вершы Уладзіміра Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына», «Залатая асенняя раніца…», «Родная мова, цудоўная мова!»: асноўныя матывы лірыкі; паэтызацыя прыроды, кахання; вобразнасць, багацце форм вершаў.

43. Байкі Кандрата Крапівы «Ганарысты Парсюк», «Дыпламаваны Баран»: крытыка чалавечых заган і недахопаў: невуцтва, ганарыстасці, фанабэрлівасці, агрэсіўнасці; прыёмы стварэння камічных сітуацый; народная мудрасць, гумар у байках; мараль як выяўленне аўтарскай пазіцыі.

44. Камедыя Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім»: час напісання твора; актуальнасць праблем, узнятых у камедыі; канфлікт у п’есе.

45. Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна; эвалюцыя характару Тулягі ў п’есе Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім»; вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі (Чарнавус, Левановіч, Вера).

46. Апавяданне Міхася Зарэцкага «Дзіўная»: адлюстраванне псіхалогіі людзей з новым светапоглядам; драматызм лёсу Шумавай; маральная праблематыка, асэнсаванне вечнага і часовага ў творы.

47. Вершы Петруся Броўкі «Спатканне», «Пахне чабор»: патрыятычны і грамадзянскі пафас твораў паэта; выяўленне палымянай веры ў перамогу; разнастайная гама перажыванняў лірычнага героя; паэтызацыя першага кахання, адметнасць паэтычнага сінтаксісу.

48. Вершы Аркадзя Куляшова «Мая Бесядзь», «Спакойнага шчасця не зычу нікому...», «На паўмільярдным кіламетры», «Нябёсы – акіян, я знаў даўно…»: грамадзянская, маральна-этычная і філасофская праблематыка вершаў; раскрыццё агульначалавечага праз глыбока асабістае; услаўленне бязмежнасці пазнання сябе і свету.

49. Звесткі пра жыццё і творчасць Аркадзя Куляшова. Лірыка паэта перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Аналіз балады «Над брацкай магілай».

50. Вершы Максіма Танка «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...», «Не знаю...». Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае і духоўнае прызначэнне.

51.Звесткі з біяграфіі Максіма Танка. Верш «Родная мова»: сцвярджэнне нязломнай духоўнай сілы беларускага народа.

52. Апавяданне Кузьмы Чорнага «На пыльнай дарозе»: мастацкае ўвасабленне аўтарскай формулы «Чалавек – гэта цэлы свет»; майстэрства пісьменніка ў раскрыцці ўнутранага свету герояў; гуманістычны і жыццесцвярджальны пафас апавядання; сімвалічны сэнс вобраза дарогі.

53. Раман Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні»: час напісання твора; асаблівасці сюжэта і кампазіцыі; драматычны лёс ахвяр Першай і Другой сусветных войнаў. Няздзейсненыя мары старэйшага пакалення (Нявады, Сымона Ракуцькі).

54. Раман Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні». Аўтарская канцэпцыя будучыні беларускага народа; тэма скрадзенага дзяцінства; вобразы галоўных герояў твора; антываенны пафас рамана.

55. Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945). Агульная характарыстыка. Антываенны пафас і вызваленчыя матывы беларускай літаратуры. Тэма Радзімы, яе будучыні. Паказ суровай праўды вайны, услаўленне мужнасці і гераізму народа-змагара, асуджэнне здрады Радзіме (можна на прыкладзе: Міхась Лынькоў «Васількі», Кузьма Чорны «Вялікае сэрца» і «Пошукі будучыні», Аркадзь Куляшоў «Маці» , «Балада аб чатырох заложніках» і інш.).

56. Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945). Адлюстраванне трагедыі чалавека на вайне. Адметнасць творчасці беларускіх пісьменнікаў у гады вайны: перавага лірыкі, публіцыстыкі, сатыры (можна на прыкладзе: Міхась Лынькоў «Васількі», Кузьма Чорны «Вялікае сэрца» і «Пошукі будучыні», Аркадзь Куляшоў «Маці» , «Балада аб чатырох заложніках» і інш.).

57. Беларуская літаратура пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945–1965). Творчасць Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Аркадзя Куляшова і інш.: патрыятычны і жыццесцвярджальны пафас, тэматыка і праблематыка.

58. Вершы Пімена Панчанкі «Герой», «Родная мова», «Той дзень прапаў і страчаны навекі...», «Спарышы», «Крык сойкі»: разнастайнасць тэматыкі; лірызм і публіцыстычнасць твораў; разнастайнасць рытміка-інтанацыйнага малюнка.

59. Звесткі пра жыццё творчасць Івана Мележа. Раман «Людзі на балоце»: творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка «Палескай хронікі».

60. Майстэрства раскрыцця ўнутранага свету галоўных герояў – Васіля Дзятла і Ганны Чарнушкі ў рамане Івана Мележа «Людзі на балоце», нетрадыцыйны падыход аўтара да раскрыцця псіхалогіі заможных сялян.

61. Чалавек і прырода ў рамане Івана Мележа «Людзі на балоце». Псіхалагічнае майстэрства Мележа-празаіка.

62. Развіццё беларускай літаратуры ў 1960-х – пачатку 1990-х гадоў. Агульная характарыстыка. Літаратура ва ўмовах новай грамадска-палітычнай сітуацыі. Значнасць гісторыка-сацыяльных пераўтварэнняў. Пашырэнне сферы мастацкага асэнсавання рэчаіснасці.

63. Жанравыя і тэматычныя пошукі літаратуры 1960-х – пачатку 1990-х гадоў., паглыбленне яе чалавеказнаўчага і гуманістычнага зместу. Узмацненне аналітызму ў даследаванні мінулага і сучаснасці. Антываенны пафас творчасці пісьменнікаў філалагічнага пакалення.

64. Звесткі пра жыццё і творчасць Івана Шамякіна. Праблематыка твораў пісьменніка.

65. Аповесць Івана Шамякіна «Непаўторная вясна» (1-я кніга пенталогіі «Трывожнае шчасце»): адлюстраванне даваеннага жыцця моладзі; духоўны свет Пятра і Сашы, іх узаемаадносіны; паэзія кахання і прыгожых чалавечых пачуццяў; маральна-этычная праблематыка аповесці.

66. Раман Івана Шамякіна «Сэрца на далоні»: праблематыка рамана; маральна-этычная сутнасць аўтарскай пазіцыі; рэтраспектыўны зварот да падзей вайны; вастрыня канфлікту.

67. Раман Івана Шамякіна «Сэрца на далоні»: вобразы кар’ерыста Гукана і Кірылы Шыковіча, Зосі Савіч, Яраша; маладое пакаленне ў рамане.

68. П’еса Андрэя Макаёнка «Зацюканы апостал»: жанравая адметнасць твора; спалучэнне ў творы камічнага і трагічнага; умоўнасць часу і месца дзеяння;

69. П’еса Андрэя Макаёнка «Зацюканы апостал»: характарыстыка персанажаў, іх сімвалічнасць і падкрэсленая абагульненасць; маральна-этычны змест камедыі.

70. Звесткі пра жыццё і творчасць Янкі Брыля. Апавяданне «Memento mori»; лірычныя мініяцюры «Загадка», «Трохі пра вечнае».

71. Паказ вайны ў апавяданні Янкі Брыля «Memento mori». Маральны подзвіг старога селяніна ў творы. Уменне аўтара бачыць гераічнае за рамкамі бытавых сцэн. Асуджэнне фашызму ў апавяданні. Мастацкае ўвасабленне народнага гераізму. Урачыстая танальнасць аўтарскага пісьма.

72. Жанр міні-прозы ў творчасці Я. Брыля. Паэтычнасць «імгненняў жыцця». Сродкі стварэння мастацкага вобраза ў «малой прозе». Ідэя разнастайнасці жыцця і яго адлюстраванне ў творчасці.

73. Звесткі пра жыццё і творчасць Васіля Быкава. Аповесці «Жураўліны крык» і «Знак бяды».

74. Аповесць Васіля Быкава «Жураўліны крык». Мастацкая праўда ў паказе вайны. Паводзіны чалавека ў экстрэмальнай сітуацыі. Раскрыццё ў трагічных абставінах характараў герояў.

75. Аповесць Васіля Быкава «Жураўліны крык». Вытокі подзвігу старшыны Карпенкі, байцоў Глечыка, Фішара, Свіста. Праблема маральнага выбару. Глыбіня псіхалагічнага аналізу ў раскрыцці вобразаў Аўсеева і Пшанічнага.

76. Аповесць Васіля Быкава «Знак бяды». Маральна-філасофская праблематыка твора. Вастрыня трагедыйнага канфлікту. Маштабнасць характараў галоўных герояў – Петрака і Сцепаніды.

77. Аповесць Васіля Быкава «Знак бяды». Зварот аўтара да эпізодаў даваеннага жыцця. Паказ прыслужнікаў акупацыйнага рэжыму. Глыбокі псіхалагізм твора. Мастацкая сімволіка аповесці. Значэнне творчасці Васіля Быкава для развіцця беларускай літаратуры.

78. Звесткі пра жыццё і творчасць Уладзіміра Караткевіча. Праўдзівасць адлюстравання чалавечых характараў у творах пісьменніка. Праблематыка творчасці. Сувязь з гістарычнымі падзеямі.

79. Аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Гістарычная аснова твора. Каларыт, атмасфера мінулай эпохі (80-я гг. XIX ст.). Роздум аб прызначэнні чалавека на зямлі, аб лёсе беларускага народа, узаемасувязі розных гістарычных эпох.

80. Аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Праблемы дабра і зла, кахання, мужнасці і гераізму. Вобразы Андрэя Беларэцкага, Андрэя Свеціловіча і Надзеі Яноўскай. Асаблівасці кампазіцыі твора.

81. Раман Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі». Праблематыка твора. Гісторыя і сучаснасць у рамане.

82. Раман Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі». Антон Косміч як носьбіт ідэй гуманнасці і патрыятызму. Адлюстраванне непераможнасці дабра і чалавечнасці. Мастацкія асаблівасці твора.

83. Апавяданне Міхася Стральцова «Сена на асфальце»: тэма і ідэя твора; эцюды-ўспаміны пра маладосць, каханне, жыццёвыя праблемы і клопаты; вобраз аўтара-апавядальніка і іншых герояў; прырода ў апавяданні.

84. Вершы Яўгеніі Янішчыц «Ты пакліч мяне. Пазаві...», «Чаму ніколі не баюся я...», «Не воблака, а проста аблачынка...», «Любоў

мая...»: багацце тэматычнай палітры – малая радзіма, казачная палеская прырода, вясковы і гарадскі побыт, лірыка кахання.

85. Вершы Ніла Гілевіча «Край мой беларускі, край!..», «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Страціў слова, страціў спадчыннае слова...». Асноўныя тэмы паэзіі Ніла Гілевіча.

86. Глыбокі лірызм, песеннасць вершаў, фальклорныя матывы ў паэзіі Ніла Гілевіча .

87. Раман у вершах Ніла Гілевіча «Родныя дзеці». Праблематыка твора. Вобраз галоўнага героя Сцяпана Вячоркі. Героі другога плана і іх роля ў творы. Сюжэтна-кампазіцыйная структура. Значэнне лірычных адступленняў.

88. Апавяданне Івана Навуменкі «Сямнаццатай вясной»: паказ лёсу моладзі ў гады барацьбы з фашызмам; раскрыццё характараў Цімоха, Стасі; сімвалічнасць вобраза бэзу.

89. Вершы Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей», «Неруш», «Яна адна, зямля вякоў…», «Бацьку», «Заспаная раніца мжыстая…», «Чалавек не ўзнікае так…»: паэтычныя вобразы Радзімы, зямлі бацькоў і беларускага народа ў паэзіі слыннага творцы.

90. Услаўленне роднага слова як духоўнай святыні; роздум пра сэнс чалавечага жыцця і повязь пакаленняў у вершах Рыгора Барадуліна.

91. Творы Алеся Разанава «Радзіма…», «Кожны народ мае…», «У крузе», «Спадчына», «Горад»: філасофска-інтэлектуальны кірунак творчасці.

92. Паэзія Алеся Разанава: тэма Бацькаўшчыны ў лірыцы паэта; адметнасць творчай індывідуальнасці; жанрава-стылёвыя асаблівасці лірыкі; асацыятыўная вобразнасць.

93. Навелы Георгія Марчука «Канон Гарыні», «Канон Маці»: жанрава-стылёвая спецыфіка твораў; асэнсаванне жыцця палешукоў, іх традыцый; мудрасць разумення аўтарам чалавечага шчасця і іншых духоўных каштоўнасцей.

94. П’еса Алеся Дударава «Князь Вітаўт»: наватарскі падыход драматурга да ўвасаблення далёкага мінулага; жанравая адметнасць твора, асаблівасці яго кампазіцыі;

95. П’еса Алеся Дударава «Князь Вітаўт»: Вітаўт і Ягайла як вобразы-тыпы; завастрэнне маральна-этычнага канфлікту; праблема асабістага шчасця ў п’есе.

96. Верш Міхася Башлакова «Заркапад», цыкл вершаў «Радзіма...»: свет Радзімы-Беларусі ў творчасці паэта, выяўленне пачуцця любові да зямлі бацькоў; знітаванасць з родным краем як духоўная аснова ўнутранага свету лірычнага героя; філасофскі роздум пра хуткаплыннасць часу і сэнс чалавечага жыцця.

97. Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе. Змяненне ролі літаратуры ў жыцці грамадства. Новая літаратурная сітуацыя. Утварэнне і дзейнасць грамадскага аб’яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», яго супрацоўніцтва з пісьменнікамі іншых краін свету. Творчасць пісьменнікаў-землякоў. Літаратурна-мастацкая перыёдыка (часопісы «Полымя», «Маладосць» і інш.).

98. Сучасная беларуская паэзія: паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі; наватарства ў галіне вершаванай формы і іншыя мастацкія пошукі сучаснай паэзіі. Агляд творчасці 2-3 паэтаў на выбар (Янка Сіпакоў, Юрась Свірка, Генадзь Пашкоў, Міхась Пазнякоў, Раіса Баравікова, Мар’ян Дукса. Уладзімір Карызна, Алесь Бадак, Навум Гальпяровіч, Мікола Мятліцкі, Алесь Разанаў, Віктар Шніп і інш.).

99. Сучасная беларуская проза: тэматыка і сацыяльна-філасофская праблематыка сучаснай прозы; асэнсаванне пісьменнікамі стасункаў асобы і грамадства, повязі часоў і пакаленняў. Агляд творчасці 1-2 празаікаў на выбар (Алесь Савіцкі «Пісьмо ў рай», Уладзімір Сцяпан «Адна капейка», Іван Чыгрынаў «Вяртанне да віны», Іван Навуменка «Вір», Янка Сіпакоў «Кулак» і інш).

100. Сучасная беларуская драматургія: тэндэнцыі развіцця беларускай драматургіі на сучасным этапе; узмацненне цікавасці да гістарычнага мінулага; новыя мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай драматургіі. Агляд творчасці 1-2 драматургаў на выбар (Уладзімір Бутрамееў «Страсці па Аўдзею», Алесь Петрашкевіч «Меч Рагвалода», Раіса Баравікова «Барбара Радзівіл», Ігар Сідарук «Галава» і інш.).